ДУА “Сярэдняя школа №7 г. Брэста”

# Захаванне традыцый беларускага народа, адносіны да беларускай культуры ў дэкаратыўна – прыкладной творчасці

**Жыліч Кірыл Андрэевіч,**
**вучань 8”Б” класа**

**Кіраўнікі: Салей Святлана Васільеўна**
**Сцепанюк Святлана Васільеўна**

г.Брэст 2021

**Змест**

ПАШПАРТ ПРАЕКТА……………………………………………2

УВОДЗІНЫ..........................................................................................3-4

ГЛАВА 1. Беларуская лялька ……………………………………5-6

1.1.Беларуская лялька з тэкстылю....................................................6-7

1.2. Беларуская лялька з гліны..........................................................7-8

1.3. Беларуская лялька з саломы.......................................................8-9

ГЛАВА 2. Традыцыі і сучаснасць у дэкаратыўна-прыкладной творчасці………………………………………………………9

ЗАКЛЮЧЭННЕ.................................................................................. 10

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ.................................................11

ДАДАТКІ

Дадатак 1. Лялькі з тэкстылю......................................................... 12-14

Дадатак 2. Лялькі з тэкстылю (сучасныя).................... ...................15-16

Дадатак 3 Лялькі з гліны..................................................................17

Дадатак 4 Лялькі з саломы ..............................................................18-19

Дадатак 5. Традыцыі і сучаснасць....................................................20-22

## ***Пашпарт праекта***

***Назва праекта:*** Захаванне традыцый беларускага народа, адносіны да беларускай культуры ў дэкаратыўна - прыкладной творчасці

***Тып праекта:*** творчы

***Адукацыйная вобласць:*** мастацтва, тэхналогіі

***Метады праекта:*** інфармацыйна-пошукавы, даследчы, практычны

***Формы прадстаўлення вынікаў праекта:*** тэарэтычная, практычная

## Уводзіны

Нам, беларусам, засталася багатая і невычэрпная спадчына, у тым ліку і народнае мастацтва – адно з самых традыцыйных відаў нацыянальнай культуры. У народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ўвасобілася неабдымная, вечна жывая душа народа, яго багаты, назапашаны стагоддзямі практычны вопыт і эстэтычны густ.

Праблема адносін да сваіх каранёў не новая, але ж тым не менш важная і цікавая. Мяне захапляюць традыцыі, творчасць, гісторыя майго краю. Народная творчасць – адна з самых важных і найбольш адметных галін нацыянальнай культуры.. Мне цікава даведацца як развіваецца беларуская культура сёння, якія напрамкі актуальныя ў сучасным мастацтве, якія традыцыі захаваліся да сённяшняга часу. Што падштурхоўвае людзей звяртацца да беларускай культурнай спадчыны.

Нельга не заўважыць, што сучаснае народнае мастацтва прыкметна змяніла характар і змест, месца і ролю ў грамадстве. Як бы мы не імкнуліся дакладана паўтарыць колішнія ўзоры, у большасці выпадкаў яны ўжо страцілі не толькі сваё ранейшае прызначэнне, але і спрадвечны глыбінны сэнс і змест. Засталася ў мінулым досыць істотная аснова народнай творчасці. Ранейшыя практычныя функцыі ў сучасным побыце пакуль яшчэ захоўваюць хіба толькі некаторыя формы, напрыклад ганчарства, пляценне з саломы, выраб лялек.

Як аказалася, рукатворныя вырабы народных майстроў сёння запатрабаваныя ўжо не столькі як бытавыя, утылітарныя, колькі як дэкаратыўныя, мастацкія творы, а таксама як нацыянальна адметныя сувеніры. У сувязі з гэтым сучаснае народнае мастацтва прыкметна мяняе свой характар, асартымент вырабаў, іх формы і дэкор. На першы план вылучаюцца дэкаратыўныя, мастацкія задачы, утылітарнасць і функцыянальнасць нярэдка ўвогалле адсутнічаюць.

Як бачым, вырабы сучасных рамёстваў і промыслаў сталі ўжо цалкам задавальняць нашы мастацкія, духоўныя патрэбы ў рукатворных, нацыянальна-адметных вырабах, якія уносяць непаўторнасць і адухоўленасць у наш досыць стандартызаваны побыт.

Прыкметна змяніліся не толькі роля і характар сучаснага народнага мастацтва. Яно перестала быць масаваю з’яваю, усеагульным заняткам. Сёння традыцыйнай мстацкай творчасцю займаюцца асобныя майстры. Звычайна гэта людзі адукаваныя, якія сваёю працай падтрымліваюць, адраджаюць і развіваюць традыцыі рамёстваў, засвойваюць іх тэхналогію, нацыянальныя і мастацкія асаблівасці з літаратуры, сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэту.

Метадалагічную аснову даследавання складае комплексны падыход да аналізу вырабаў з асабістых калекцый Андрановіч А.М., Качуры Н.К., Казейкі В.А, Жыліча К. А., спецыяльнай літаратуры, электронных і інтэрнэт-рэсурсаў, у якіх спалучаюцца этнаграфічныя, мастацтвазнаўчыя і гістарычныя звесткі.

***Практычная значнасць*** праекта заключаецца ў магчымасці далейшага вывучэння народных мастацкіх лялечных традыцый. Такая праца выклікае цікавасць у дзяцей і дарослых і можа стаць асновай рэалізацыі многіх сямейных праектаў.

***Аб'ект даследвання:*** традыцыйная беларуская лялька

***Асноўная ідэя праекта***: традыцыйная лялька – незаменны матэрыял для далучэння дзяцей да народнай культуры, якая дае вялікія магчымасці для творчай самарэалізацыі і развіцця асобы.

***Галоўная мэта даследчай працы***: далучэнне да культурнай спадчыны, вывучэнне традыцый вырабу лялькі і выкарыстання яе ў народнай педагогіцы.

***Задачы праекта:***

1) пазнаеміць дзяцей з традыцыйнымі беларускімі лялькамі;
2) сабраць інфармацыю пра розныя віды лялек;
3) развіваць творчыя здольнасці праз стварэнне лялькі;
4) садзейнічаць выхаванню павагі да народнай творчасці.

***Гіпотэза праекта:*** і ў наш час традыцыйныя беларускія лялькі могуць быць створаны сучаснымі дзецьмі і выкарыстоўвацца для гульняў, асабістых зносін, развіцця мастацкай творчасці і далучэння да вопыту беларускага народа.

## Асноўная частка

## Беларуская лялька

З пачатку XVI стагоддзя на беларускіх землях пачала распаўсюджвацца батлейка, тады ж пачала развівацца лялечная справа, але ж у перыяд XVII-XVIII ст. ад батлеечнага тэатра аддзяліўся яшчэ «свецкі» лялечны тэатр. Далей лялькі перасталі быць так моцна прывязанымі да тэатру і выліліся ў асобную частку мастацтва, таксама цвёрда ўкараніўшыся ў беларускай культуры. Лялькі былі розныя, рознае было і іх прызначэнне. Напрыклад, лялька «дзесяціручка» павінна была дапамагаць па гаспадарчай працы, яе дзесяць рук азначалі працавітасць. Цікавым фактам з'яўляецца тое, што у лялек няма вачэй. Лічылася, што праз вочы лялькі можна нашкодзіць яе ўладальніку. Таксама шмат лялек рабілася на розныя святы.

Са старажытных часоў лялькі з тканіны, гліны, на Беларусі былі традыцыйнай цацкай беларускага народа. Гульні ў лялькі ўсхваляліся дарослымі, бо, гуляючы з імі, дзеці вучыліся весці гаспадарку, набывалі сямейны вопыт. Лялька была не проста цацкай, а сімвалам працягу роду, закладам сямейнага шчасця.

Што трэба было ўлічваць пры вырабе лялек:

**Час сутак**. Па народных павер'ях начны час - гэта гадзіна паскуддзя. Тады яна здабывае найбольшую сілу, якую губляе з надыходам світання. Таму лепшым часам для вырабу лялькі быў сонечны дзень. Славяне пакланяліся сонцу. Яны лічылі, што сонечнае святло валодае ачышчальнай і ахоўнай уласцівасцю.

**Час працы**. Вельмі важна было зрабіць лялечку за раз, не адрываючыся ад працы над талісманам. Гэта не толькі дапамагала сканцэнтравацца, але і не давала становучай энергіі, сфарміраванай падчас вырабу, рассеяцца.

**Самаадчуванне**. Пры вырабе лялькі майстрыха ўкладвала часцінку сваёй энергіі, а значыць, яе розум павінен быў быць чысты, сэрца спакойнае, а душа - напоўненая радасцю.

**Матэрыялы.** Выкарыстоўваліся толькі натуральныя матэрыялы, якія неслі ў сабе прыродную энергетыку.

Гэта агульныя правілы, якія прымяняліся да ўсіх лялек. Рукатворныя лялькі на працягу стагоддзяў суправаджалі побыт беларускіх сялян. Яны беражліва захоўваліся ў куфрах і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Малым дзеткам лялькі шылі мамы, старэйшыя сёстры, бабулі. Пры ўсёй сваёй занятасці яны знаходзілі для гэтага час. Дзіця спецыяльна навучалі традыцыйным прыёмам вырабу лялькі, і гадоў з пяці найпростую ляльку магла зрабіць любая дзяўчынка. А пачыналі дзяўчынак вучыць вырабляць лялькі ўжо з трохгадовага ўзросту. Галоўная асаблівасць лялькі заключалася ў тым, што зроблена яна

была без іголкі і безаблічная. Для дзіцяці лялька з’яўлялася цацкаю - сяброўкай і абярэгам адначасова, таму калоць яе іголкай нядобра, а рабіць твар па народных павер'ях нельга, так як такая лялька можа здабыць душу і стаць небяспечнай. А «безаблічная» лялечка лічылася прадметам неадушаўлёным і не магла нашкодзіць дзіцяці. Зробленая з любоўю сваімі рукамі лялечка была прадметам гонару яе майстрыхі.

## 1.1. Беларуская лялька з тэкстылю

Лялька – цацка звычайна выяўляе чалавека або жывёлу. аднак лялька можа не выяўляць, а толькі азначаць якую-небудзь сапраўдную або фантастычную істоту. Напрыклад, для дзіцяці, якое скача вярхом на палцы, гэта палка азначае яго каня.

Лялькі як дзіцячыя цацкі з'явіліся яшчэ ў дагістарычныя часы. Па форме яны былі даволі прымітыўнымі, а выяўлялі і/або азначалі знешнасць людзей або іншых жывых істот.

Напрыклад, “**Карміцелька”** – сімвал урадлівасці і мацярынства. Яна суправаджала дзіця з самага дзяцінства і да таго часу, пакуль не “сыходзіла” (ірвалася, псавалася). З Карміцелькай можна і трэба было мець зносіны, дзяліцца радасцямі ці непрыемнасцямі, удзяляць ёй час і клопат. За гэта вы будзеце ўзнагароджаны яе любоўю і дапамогай. У цяжкія для чалавека часы рэкамендавалася браць ляльку ў рукі і мець зносіны з ёй часцей, каб жыццё наладзілася.

**“Дзесяціручка”** – абрадавая шматрукая лялька. Каб паспець усё зрабіць па гаспадарцы, дзвюх рук бывае недастаткова. Вось і прыдумалі жанчыны сабе ў памочніцы многа ручак. Шасціручку рабілі, каб дапамагала па гаспадарцы, ахоўвала майстрыху ў рабоце. Многа ручак рабілі 14 кастрычніка на Пакроў, калі заканчваліся работы ў полі і агародзе і жанчыны садзіліся за рукадзелле.

**“Аддарак-на-падарунак”** – самая простая анучная лялька. У ёй закладзены вялікі сэнс: пачынаючы з 2-гадовага ўзросту ў знак удзячнасці за атрыманы падарунак дзяўчынка павінна была аддарыцца вось такой лялькай. З 4 гадоў гэтую ляльку маленькая гаспадынька павінна была ўжо ўмець зрабіць сама. Акрамя таго, дзяўчынка з малых гадоў патроху далучалася да таямніц рукатворнага майстэрства, яна засвойвала і правілы паводзін сярод людзей – вучылася выказваць сваю ўдзячнасць.

Гульнявая лялька “**Карагодніца”.** Дзяўчынка пракручвала ў руках палачку, на якой трымалася лялька, і здавалася, што тая кружыцца ў карагодзе. Калі дзяўчынка падрастала, мама ёй давала лялек-карагодніц. Дзіця іх круціла і развівала адначасова дзве ручкі. Дзяўчынкі дапускаліся да карагода толькі ў пэўным узросце. А як прыйсці ў дзявочы карагод, не ўмеючы яго вадзіць?

Заблытаеш усё, іншых саб’еш, сама расхвалюешся. І замест радасці — адны засмучэнні. Вось яны і вучыліся загадзя на такіх ляльках у гульні.

А лялька **«Спірыдон- сонцаварот»**, абярэг з цікавай гісторыяй, якая сыходзіць сваімі каранямі ў язычніцкую старажытнасць, рабілася ў гонар аднайменнага свята зімовага сонцавароту, якое адзначалася 21 снежня. Галоўным духам лічыўся Сварог- Бог агню. Лялька павінна была застерагаць людзей ад розных бед, падобна сонцу, якое заўсёды глядзіць і засцерагае чалавека. Паварочваецца сонца – ноч становіцца карацейшая, а дзень прырастае. Вось так і ў жыцці. Калі наступае чорная паласа – Спірыдон паваротам жыццёвага кола змяняе лёс. Яшчэ лялька “Спірыдон – сонцаварот” дапамагае мужчыну ў кіраванні светам. А цяпер гэта і абярэг у машыну. **(Дадатак1)**

Традыцыйна абрадаваю лялькаю лічылася каза. Сімвал жыццёвай сілы, плоднасці, радасці. Яна галоўная удзельніца абрадавых дзеянняў у час святак. Старажытныя беларусы верылі, што калі на святкі ў хату зойдзе каза, то год будзе вясёлым і шчаслівым. За гэтай жвавай і крыху задзірыстай постаццю хаваецца вобраз жаночага бажаства. Рожкі на галаве, кошычак або мяшэчак з “багаццямі”, незалежны, вясёлы, пераменчывы нораў прыводзіць да думкі пра лунную багіню. У славянскай традыцыі такой была Макош – прамаці багоў, якую часта прадстаўлялі ў рагатым галаўным строі ці з рогам дастатку. Дзякуючы гэтаму у нашых продкаў прысутнічалі “рагатыя галаўныя строі” для замужніх жанчын. Існавала павер’е, што галоўных багоў некалі выкарміла менавіта каза. **(Дадатак 2)**

## 1.2. Беларуская лялька з гліны

Дэкаратыўна - прыкладное мастацтва прынята дзяліць на асобныя віды ў адпаведнасці з матэрыялам і сыравінай. Беларускія народныя майстры з даўніх часоў выкарыстоўвалі тыя матэрыялы, якіх заўсёды хапала на нашай зямлі: гліну, лазу,лён, авечую воўну, салому. Гэтыя ж матэрыялы выкарыстоўвалі і пры выврабе лялек.

Вырабы з гліны – ганчарства – старадаўняе народнае рамяство. Гліна, сыравіна для ганчарных спраў, знаходзілася ў наваколлі амаль што кожнай вёскі, прылады працы былі ў кожнай сялянскай гаспадарцы. Рыдлёўкамі капалі гліну і стругалі яе касамі. Спачатку вырабы проста ляпілі з гліны, пазней карысталіся ганчарным кругам. Для абпальвання керамікі будавалі невялікую печ-горан з камянёў. Калі вырабаў было нямнога, толькі для сваёй гаспадаркі, абпальвалі ў хатняй печы.

Самая масавая знаходка пры раскопках старажытных паселішчаў – гліняны посуд ці яго рэшткі. Але выраблялісі і дзіцячыя цацкі. Найбольшага развіцця ганчарнае рамяство дасягнула ў канцы XIX – першай палове XX ст.,

але яно не было масавым, бо было прывязана да радовішчаў прыдатнай гліны. А ў Беларусі іх можна адшукаць праз кожныя 50-100 км. Там, дзе яны былі, гліняныя вырабы стваралі цэлыя паселішчы, асабліва, калі не было іншых магчымасцей для пражыцця. Напрыклад, у беднай на ворныя землі, але багатай на якасную гліну Гарадной, на Століншчыне, у 1920-я гады рамяством займалася 500 ганчароў. Там дзяўчына і замуж не ішла за хлопца, які не валодаў ганчарствам, бо як жа ён сям'ю пракорміць? Найбольш значныя ганчарскія асяродкі ў Брэсцкай вобласці былі ў Кобрыне, Ляхавічах, Пружанах, Ружанах, в.Дзівін Кобрынскага раёна. Мастацтва вырабу глінянай цацкі не менш старажытнае, чым выраб посуду. Яшчэ з эпохі неаліту выраблялiся з гліны фігуркі коней, сабак, іншых жывёл, а таксама бразготкі ў выглядзе шарыка. Яны мелі прызначэнне не толькі дзіцячай забаўкі, але мелі рытуальнае прызначэнне. Па старажытных павер'ях іх гук адганяў злых духаў, а фігуркі жывёл ляпілі з надзеяй паўплываць на дабрабыт. Ляльку ляпілі ў форме конуса спадніцы, якая пераходзіла ў часткі цела. Лялькі маглі быць фантазійнымі. Аб'ядноўвае ўсе гэтыя вырабы невялікі памер. З развіццём хімічнай прамысловасці з'явілася магчымасць фарбаваць цацкі, выкарыстоўваючы пры гэтым не толькі традыцыйны чорны колер, але і яркія фарбы, якія найбольш прыцягвалі дзяцей. **(Дадатак 3**)

### 1.3. Беларуская лялька з саломы

Апрача ганчарства сялянскія сем'і займаліся пляценнем. З каранёў маладой сасны плялі кошыкі для бульбы і збору грыбоў, калыскі-люлькі для немаўлят. З лыка, кары маладой ліпы, рабілі лапці – найлепшы абутак для сенакосу, розныя корабы і каробкі. Спадручным матэрыялам была салома і лён. З льнянога валакна плялі вяроўкі. Традыцыі пляцення працягваюцца і сёння, хоць у сваім натуральным выглядзе рамяство бытуе не так шырока, як раней. У адрозненне ад вырабаў з саломкі, якія з'яўляюцца перш за ўсё прадметамі дэкору, лозапляценне адказвае на патрэбы паўсядзённага жыцця.

Кожны з матэрыялаў прыдатны да апрацоўкі. Але цяжка згадаць больш празаічны матэрыял, як салома. Толькі нашы продкі меркавалі іначай. Шырокае культываванне пшаніцы і жыта давала чалавеку хлеб і адначасова – танны і выдатны матэрыял. Ён быў зручны тым, што не патрабаваў спецыяльнай падрыхтоўкі ці апрацоўкі. Вырабы з саломкі – гэта цікавы фенамен сучаснага прыкладнога мастацтва і гонар беларусаў, яны не маюць аналагаў у Еўропе. Гэта традыцыйна славянскае мастацтва, чые карані сыходзяць да старажытных паганскіх культаў хлеба.У розных формах народнай творчасці, каляндарных звычаях і абрадах да гэтага часу выяўлялася сімволіка коласа, зерня, з чым звязваліся ўрадлівасць хлебнай нівы і сямейны дабрабыт. "Дух хлеба" ўвасаблялі фігуры ў выглядзе жывёл і птушак. Разнастайныя

рытуальныя вырабы з саломы цесным чынам звязваліся з каляндарнымі абрадамі і звычаямі, галоўным чынам з дажыначнымі. Гэта абумовіла непрацягласць іх бытавання, максімум – год, як і дажыначны сноп. Але час уносіў пэўныя карэктывы. Магічная функцыя саломы, якая ў старажытнасці надавалася звычайным сцяблінам ці каласкам, з часам стала дапаўняцца дэкаратыўнымі якасцямі. Сапраўды жыццёвыя рысы надаваліся лялькам. У якасці матэрыялу ужывалася толькі салома, яны не мелі твару, не выкарыстоўвалася тканіна для дэманстрацыі вопраткі. Але салома, з якой яны былі зроблены, напаўняла іх незвычайным колерам і цеплынёй. Пластыка саламяных лялек і да нашых дзён захавала першапачатковую прастату. Яны былі лёгкія, аб'ёмныя, замацоўваліся часткі цела з дапамогай тонкай лазы, каранёў ці тоўстымі ніткамі. Што датычыцца формаў саламянай лялькі, то яны і да апошняга часу захавалі прастату, якая была выклікана ўтылітарным прызначэннем. Яны не вызначаюцца адмыславатасцю формаў або нейкім дэкорам. Лаканізм і прастата іх формаў – гэта не спрошчанасць, а іх адпрацаванасць і дасканаласць. Не дзіва, што калі іншы гараджанін напаткае такую ляльку, не пагрэбуе паставіць яе на пачэснае месца. **(Дадатак 4)**

## Традыцыі і сучаснасць у дэкаратыўна-прыкладной творчасці

Але ж ці захавалася лялечная справа да сённяшняга часу? Адказ можна знайсці ў сетцы інтэрнэт. Гэта складаная, шматаспектная з'ява. Некаторыя віды стварэння лялек захаваліся амаль без змянення ў сваіх традыцыйных формах, другія, прыстасоўваючыся да сённяшняга побыту і сучасных культурных працэсаў, набылі новае жыццё , пры гэтым змяніўшы характар, формы, асаблівасці бытавання і прымянення.

Цяперашнія дзеці гуляюць з зусім іншымі лялькамі - прыгожымі, вырабленымі з пластмасы, фарфору. Што датычыцца лялек, узровень цікавасці да іх свету застаецца высокім і цяпер. Ёсць шэраг мастакоў, якія займаюцца вырабам аўтарскіх лялек. А ў нашай краіне ёсць нават *Дзень беларускай лялькі*, які адзначаецца ў лістападзе.

Жыццё імкліва ляціць наперад. І, здабываючы кожны дзень нешта новае для сябе, мы непрыкметна губляем тое святое, спрадвечнае, што нашы продкі называлі непарыўнай повяззю часоў, – нашу спадчыну. А яна выяўляецца як у людзях, так і ў прадметах штодзённага побыту мінулых стагоддзяў.
**(Дадатак 5)**

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Ва ўмовах інтэнсіўных эканамічных, гандлёвых, інфармацыйных кантактаў культура Беларусі непазбежна адчувае магутны ўплыў яе масавых відаў і стандартаў. Існуе шмат відэа аб тым, як вырабляць лялькі. Гэта азначае, што любы чалавек можа далучыцца да вырабу лялькі. Акрамя таго, што гэты працэс мае функцыю зберажэння і сцвярджэння нацыянальных мастацкіх каштоўнасцей, тут яшчэ і ярка выяўлены эстэтычны характар. Лялька, выробленая сваімі рукамі - гэта арыгінальны і просты падарунак, які падабаецца амаль кожнаму. Паводле водгукаў тых, хто атрымаў іх у падарунак, лялькі, зробленыя сваімі рукамі, падабаюцца людзям нават больш за тыя, што купляюць у краме. Людзі цікавяцца сваёй гісторыяй і культурай, таму расце цікавасць да народнага мастацтва.

Народныя лялькі развіваюць у дзяцей фантазію, мастацкі густ, садзейнічаюць патрыятычнаму выхаванню. Створаныя з павагай да роднай культуры, яны заслугоўваюць увагі і захаплення: іх умоўнасць, схематычнасць не ад беднасці, а ад багацця фантазіі народа-стваральніка. Яны маюць асаблівую энергію, дораць супакой, захоўваюць цяпло чалавечых рук, якія іх стварылі, і спрыяюць сувязі пакаленняў.

Мы,сучасныя дзеці, асабліва гарадскія, амаль адарваныя ад беларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч, аніводны прадмет убранства ці адзення не мог узнікнуць па - за межамі традыцыйнага мастацтва. Створаныя па строгіх канонах, выпрабаваных стагоддзямі, яны разам з песнямі, казкамі, святамі з маленства выхоўвалі густ і пачуццё прыгажосці, а потым навучалі і саміх дзяцей , як зрабіць усё гэта хараство сваімі рукамі.

Беларусам робіць асяроддзе матчына мова, бацькава хата, родны горад, першая казка, кніга, лялька.

Менавіта ў дзяцінстве закладваецца падмурак разумення сувязі са сваім народам, з пэўнаю часткаю Зямлі - Бацькаўшчынай. Дзіця гуляе у цацкі - гэта для яго сур’ёзная справа, бо праз гульні ён засвойвае веды, знаёміцца з навакольным светам, таму цацкі для нашых дзетак і па - за плынню беларускай народнай культуры – нонсэнс. А так быць не павінна.

***Спіс выкарыстаных крыніц***

1. Качан Г.К. Куклы. Энциклопедия народного мастера. –Минск, 2017.

2. Зимина, З.И. Текстильные обрядовые куклы: методическое пособие / З.И. Зимина. – Минск, 2006.

3. Народная культура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2002.

4. Сахута, Я. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-ое выд., перапрац. і дап. / Я. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2001.

5. Церашковіч, Т.А. Лялька беларуская / Т.А. Церашковіч. – Мінск : Полымя, 1992.

Дадатак 1



**Як зрабіць ляльку “Спірыдон- сонцаварот”**







Дадатак 2





Жыліч К. 8-Б клас

Дадатак 3



Качура У. 8-Д клас

Дадатак 4



Андрановіч М. 5-Д клас





Казейка М. 6-Д клас



Баранчыкава Д. 11- Г клас

Дадатак 5




Сучасная лялька



Качура У. 8-Д клас




Этнаграфічны куток. ДУА “Сярэдняя школа № 7 г. Брэста